# 1621 ГОД У СУПРАЦЬСТАЯННІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ СА ШВЕДСКІМ КАРАЛЕЎСТВАМ

***Дземідовіч А. В.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Першая трэць XVII ст. была азнаменавана для Рэчы Паспалітай (РП) надзвычайнай знешнепалітычнай актыўнасцю. У сістэме знешнепалітычных прыярытэтаў РП таго часу важнейшым з’яўляўся балтыйскі кірунак. Адбывалася змаганне са Швецыяй, дзе ў якасці прычыны выступілі прэтэнзіі Жыгімонта III Вазы на дынастычныя правы, што, па сутнасці, сталася барацьбой за Прыбалтыку. Заўважым, што асноўны цяжар канфлікту са Швецыяй зведала Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ), якое было ўцягнута ў вырашэнне балтыйскага пытання.

Войны першых дзесяцігоддзяў XVII ст. (1600—1611 гг.; 1617—1618 гг.) не прыносілі выразнай перавагі іх удзельнікам, і да развязкі у барацьбе за Балтыку было яшчэ далёка. Зацяжны характар канфлікту, яго негатыўныя наступствы пабуджалі шляхту ВКЛ патрабаваць прымірэння са Швецыяй. Жаданне мець трывалы мір надзвычай узмацнілася пасля перамір’я 1618 г. Адсутнасць гарантыі бяспекі, зафіксаванай мірным дагаворам, асцярога адносна магчымага нападу шведаў; агульная стомленасць ад стану вайны — усе гэта абумоўлівала адпаведную пазіцыю палітычнага народа ВКЛ. Рубяжом ва ўспрыманні свядомасцю шляхецтва ВКЛ неапраўданай паўночнай палітыкі Жыгімонта III Вазы стаў 1621 г.

Заўважым, што ў пачатку 20-х гг. XVII ст. абарона Інфлянтаў фактычна залежала ад польнага гетмана Крыштофа Радзівіла, які быў незадаволены палітыкай манарха ў справе вайны са Шведскім Каралеўствам. Крыштоф Радзівіл неаднаразова паведамляў Жыгімонту III аб неабходнасці павелічэння колькасці войска для супрацьстаяння Швецыі, але гэтыя захады не прыносілі пажаданых вынікаў. У хуткім часе стала відавочна, што дарэмна манархам, а таксама часткай шляхты Каралеўства Польскага (КП) недаацэньвалася мажлівасць пагрозы з поўначы. 21 жніўня 1621 г. шведы на чале з Густавам II Адольфам прыступілі да аблогі Рыгі. Напярэдадні гэтага Крыштоф Радзівіл разаслаў універсалы да паветаў ВКЛ, у якіх паведамляў аб наступленні шведаў, якое рыхтуецца ў кірунку Рыгі і Дыаменту, і заклікаў да абароны іх ад ворага [Księcia Krzysztofa Radziwiłła, hetmana polnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Sprawy wojenne i polityczne 1621—1632, 1859.]. У лісце да канцлера Льва Сапегі, датаваным 13 жніўня 1621 г., Крыштоф Радзівіл звяртаў увагу на набходнасць забеспячэння ваеннай кампаніі супраць Швецыі усім неабходным — жаўнерамі, грашыма, зброяй. Пры гэтым польны гетман падкрэсліваў, што актыўныя намеры шведаў пагражаюць не толькі Інфлянтам, але і непасрэдна ВКЛ. Радзівіл шукаў садзеяння Льва Сапегі ў тым, каб гэтыя пытанні былі станоўча разгледжаны на будучым сойме. Асаблівы непакой выклікаў лёс Рыгі, адносна якой было адзначана: «...кожнаму гетману Рыга правай рукой служыць, калі ён мае яе пры сабе « [Księcia Krzysztofa Radziwiłła, hetmana polnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Sprawy wojenne i polityczne 1621—1632, 1859].

Справа аб абароне Інфлянтаў стала актуальным пытаннем, якое было вынесена на абмеркаванне Варшаўскага вальнага сойма 1621 г. На сейме былі прыняты дзве канстытуцыі: асобна для КП і ВКЛ. Гэта было праявай чарговага разнагалосся паміж імі ў перыяд канфлікту РП са Швецыяй. На гэты раз яно адбылося на глебе спрэчак аб выкарыстанні паспалітага рушэння ВКЛ. Частка сенатараў КП жадала, каб ВКЛ такім спосабам разам з Каронай абараняла РП ад Асманскай імперыі. Аднак канстытуцыя ВКЛ пастанавіла іншае прызначэнне свайго паспалітага рушэння — на абарону ад Швецыі і Расійскай дзяржавы [Volumina Legum. T2, 1859].

У верасні 1621 г. Густаў II Адольф авалодаў Рыгай і вусцем Дзвіны. У дыярыўшы, занатаваўшым падзеі, якімі суправаджалася ўзяцце Рыгі, паведамлялася, што рыжане 27 верасня 1621 г. узгадвалі «аб няшчасці даўнім пад Кірхгольмам яго (Густава II Адольфа — А.Д.) бацькі і аб шчасці Густавым, што таго дня Рыгу ўзяў, у які пад Кірхгольмам (Карл IX. — *А. Д.*) быў пераможаны» [Biblioteka Muzeum Narodowego im. Czartoryskich w Krakowie (BCzart). — Rkps. 111. Teki Naruszewicza. T. 111 (1621)].»

Крыштоф Радзівіл клапаціўся аб захаванні тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, сведчаннем чаго з'яўляецца шэраг яго лістоў да службовых асобаў РП з паведамленнем аб страце Рыгі і прановамі далейшых дзеянняў. Напрыклад, у лісце да падскарбія ВКЛ Крыштофа Нарушэвіча Радзівіл пісаў, што са стратай Рыгі небяспека ўжо датычыцца не толькі Інфлянтаў, але і ўласна ВКЛ. Было заўважана, колькі карысці прынясе Густаву II авалоданне ей, бо шведскі кароль «у Рызе гарматы, порах, рыштунак, каней, харчаванне, запасную вопратку, у Рызе вялікія грошы, даходы ад усіх Інфлянтаў і Курляндыі забярэ...» [BCzart. — Rkps. 112. Teki Naruszewicza. T. 112 (1621)].

У кастрычніку 1621 г. шведы захапілі Мітаву, сталіцу Курляндскага герцагства, дакладней — яна здалася без супраціўлення. Аднак ужо вясной 1622 г. Мітава была адваявана, што, безумоўна, можна лічыць адным з нешматлікіх поспехаў РП у ваенным сутыкненне са Швецыяй перыяду 1621—1622 гг.

Падзеі 1621 г. мелі значныя наступствы. Да іх належыць заключэнне польным гетманам ВКЛ Крыштофам Радзівілам перамір'я са шведамі ў Мітаве ў1622 г., што яшчэ больш абвастрыла яго складаныя адносіны з Жыгімонтам III. Таксама перавага, якую атрымалі шведы, авалодаўшы Рыгай і часткай тэрыторыі Інфлянтаў, дазволіла Швецыі ў 1625 г. упэўнена аднавіць наступ. Акрамя таго, у гэты час яшчэ больш абвастрыліся адносіны паміж шляхтай КП і ВКЛ, яшчэ раз даказваючы, наколькі істотна раз'ядноўвала дзве часткі адзінай РП складаная знешнепалітычная сітуацыя XVII ст.

## ОСОБЕННОСТИ СОТРУДНИЧЕСТВА ЕВРОПЕЙСКОГО СОЮЗА И РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

***Достанко Е. А.,*** *Белорусский государственный университет*

В настоящее время Европейский союз позиционируется как активный участник мировой политики, придающий немаловажное значение отношениям с третьими странами путем реализации политики внешних отношений (*external relations*), которая также распространяется и на Республику Беларусь. В настоящее время в отношении третьих стран ЕС реализует семь региональных программ — Черноморское сотрудничество, Центральноазиатская стратегия, Арктическая политика ЕС, Средиземноморское партнерство, Европейское экономическое пространство, Европейская политика соседства и Северное измерение. Каждая из этих программ предусматривает определенные инструменты (финансовые, страновые стратегии на основе планов действий). Кроме того, ЕС развивает с этим странами отраслевое сотрудничество, заключает двусторонние соглашения.

На сегодняшний день сотрудничество Республики Беларусь и Европейского союза осуществляется путем технического диалога в рамках инициативы «Восточное партнерства» и многостороннего сотрудничества в Европейской политике соседства. Помощь Беларуси оказывается в рамках Страновой стратегической стратегии на 2007—2013 гг. и Национальной индикативной программы на 2012—2013 гг. В 2012 г. Европейский союз представил Европейский диалог с белорусским обществом о модернизации как специальную программу по взаимодействию с белорусским гражданским обществом. Экономическое сотрудничество регулируется единственным двусторонним